13. Сканчэньне будаўніцтва сіласных ям і траншэй к 1-му ліпеня, засеяных поўнасьцю сіласнымі культурамі выканаўшы НКЗ плошчы з выкананьнем нажу па сіласаваньню.

14. Арганізацыю ўзаемнай дапамогі з боку савгасаў і калгасаў бядняцка-серадняцкім гаспадаркам і з бедапошніх—савгасам і калгасам.

15. Больш поўнае абслугоўваньне бочых савгасаў, калгасьнікаў і бядняка-серадняцкіх гаспадарак раёну, максымальна ўцягваючы ў вытворчую і руючую працу жанчын у савгасах, калгасах, арганізуючы грамадзкае харчаваньне, дзіцячыя ўстановы,(ясьлі, плашчадкі, сады і інш.) у савгасах калгасах асабліва ў час палёвых работ.

16. Правядзеньне працы па растмачэньню сярод шырокіх мас: рабочых савгасаў, калгасьнікаў, бядняка-серадняцкага сялянства, пастаноў VI Усесаюзнага Зьезду Саветаў Х-га Ўсебеларускага Зьезда Саветаў і пастановы Ўрада аб с-г. падатку, накіраванай на разьвіцьцё с-гаспадаркі па сацыялістычнаму шляху.

Лепшымі гарантыямі выкананьня паказаных вышэй умоў зьяўляецца максымальнае разьвёртваньне працы мабілізацыі шырокіх мас рабочых савгасаў, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства на выкананьне пастаўленых Партыяй і Ўрадам задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае-гаспадаркі ў трэці рашаючы год пяцігодкі, мабілізуючы ўсе ўнутраныя рэсурсы для пасьпяховага правядзеньня другой бальшавіцкай сяўбы, больш і поўна папулярызуючы гэтыя мерапрыемствы сярод шырокіх мас пр Цэнтральныя і Мясцовыя газэты.

Старшыня Камісіі РАЧЫЦКІ.

Члены: МІЦЬКОЎ, ГНІЛЯКЕВІЧ.

Выходзім на плошчу ў 12804 га

Трактар павінен быць у баразьне ня менш як 21 гадзіну ў суткі

Шклоўская МТС прыступіла да выкананьня плянаў другой бальшавіцкай вясны ўпаўне падрыхтаванай.

Зараз МТС мае 41 трактар, якія поўнасьцю забясьпечаны прычапным інвэнтаром, запаснымі часткамі, гаручым і змазачным матар'ялам. Трактары і інвэнтар поўнасьцю адрамантаваны.

Усе трактары МТС знаходзяцца зараз на вытворчых вучастках у калгасах.

Паводле пляну, Шклоўская МТС павінна апрацаваць 12.804 га калгаснай зямлі. Гэта вялікая задача і яна павінна быць выканана. Гэтую важную задачу добра зразумеў рабочы калектыў МТС і абяцае па ўдарнаму справіцца з ускладзенымі на яго задачамі.

Кіраўніцтвам МТС падрыхтаваны кадры рулявых. Рулявыя па сканчэньні падрыхтоўчых курсаў абвясьцілі сябе ўдарнікамі другой бальшавіцкай вясны.

Шклоўская МТС абяцае:

Поўнасьцю выканаць намечаныя пляны другой бальшавіцкай, адначасна праводзячы нясупынную работу па лейшым пашырэньні калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак; поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку ў МТС прымацаваўшы да кожнага трактарыста трактарыстаў; поўнасьцю пе весьці ўсю работу МТС на зьдзельшчыну і поўнасьцю выканаць лёзунг —трактар павінен быць ў баразьне ня менш як 21 гадзіну ў суткі.

Адначасна з гэтым, МТС абавязваецца дапамагчы калгасам у ліквідацыі абязьлічкі і пераходзе на зьдзельшчыну.

МТС абвяшчае рашучую барацьбу за эканомнае выдаткаваньне гаручага і змазачнага матар'ялу, дабіваючыся большай эфэктыўнасьці трактару, прымяруючы лепшых трактарыстаў.

Памятаючы словы т. Сталіна аб тым, што «тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі вырашае ўсё» трактарысты МТС, абяцаюць поўнасьцю ва ўсіх дэталях азнаёміцца з трактарам і азнаёміць з гэтым калгасьнікаў.

Ш-кі.

Трактары на сацыялістычных палёх.

Койданаўскія апартуністы зрываюць рэалізацыю акцый Трактарацэнтру

Рэалізацыя акцый Трактарацэнтру ў Койданаўскім раёне знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Заданьне па рэалізацыі акцый ў першым квартале недавыканана на 28.070 руб. У другім квартале гэты прарыў ня быў ліквідаваны.

Райза, Райкалгассаюз і МСТ не перабудавалі свае працы ў напрамку забясьпячэньня пасьпяховага выкананьня пляну рэалізацыі акцый. Замест актыўнай работы па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру, гэтыя ўстановы займаюцца бюракратычнай канцалярскай цеганінай, пісаньнем розных рэзалюцый. Напрыклад, апартуністы з райкалгассаюзу лічаць, што гэтай работай павінна займацца толькі МТС. Сакратар райкалгассаюзу т. Папраўка паказаў брыгадзе заданьне Калгасцэнтру па рэалізацыі акцый на другі квартал. Па гэтым заданьні старшынёй райкалгассаюзу была накладзена наступная бюракратычная рэзалюцыя:

«Завострана пытаньне на вытворчай нарадзе пры МТС і дадаткова пасланa пацьверджаньне аб выкупцы і рэалізацыі акцый сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў».

Загадчык райза т. Жалкоўскі на тэлеграму НКЗ СССР т. Якаўлева ад 29-IV-31 г. аб узмацненьні работы па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру наклаў такую бюракратычную рэзалюцыю: «Да выкананьня па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру». Пасьля гэтага падпыў тэлеграму да справы.

Трэба рашуча ўдарыць па бюракратах і апартуністых, якія зрываюць кампанію рэалізацыі акцый. Перадавым калгасам, якія выканалі плян рэалізацыі трэба ўзяць на грамадзкі буксір адстаючых. Койданаўшчына павінна неадкладна ліквідаваць прарыў у рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

Брагада газэт «Ударнік Койданаўшчыны і «С. Б.»Квапінскі, Дубіцкі.

На шляху катастрофы

Веснавы сэзон у фашысцкай Польшчы ня ўнёс ніякага ажыўленьня ў будаўніцтве, ніякага ажыўленьня ў прамысловасьці і асабліва ў прамысловасьці шырокага спажываньня. Гаспадарчы крызіс з кожным днём набывае ўсё больш шырокія разьмеры і ў іншых галінах прамысловасьці прымае катастрафічны характар. Кожны дзень польскі буржуазны друк запоўнен паведамленьнямі аб банкроцтвах фірм, якія праіснавалі па 60, па 100 год. Хранічнае штодзённае зьявішча—закрыцьцё фабрык і заводаў. Сотні тысяч рабочых выкінуты на брук і не атрымліваюць ніякай дапамогі. Урадавая фашысцкая прэса заспакойвае буржуазію тым, што крызіс ужо дасягнуў гранічнага пункту і цяпер мае наступіць павольнае палепшаньне. Так, згодна заявы міністра прамысловасьці і гандлю Прыстара ў сказанай ім прамове, фашысцкая Польшча «знаходзіцца ў сучасны момант на дне крызісу, падымацца-ж з гэтага дна будзем вельмі і вельмі павольна».

На чым абгрунтавана заява палкоўніка-міністра Прыстара аб тым, што ўжо фашысцкая Польша стаіць на дне крызісу? Палкоўнік Прыстар, вядома, не падае ніякіх даных, ён адзначае толькі, што далей ужо няма куды ісьці, што, калі яшчэ крызіс паглыбляўся-б і пашыраўся-б, дык гэта абазначала-б катастрофу. Аднак, даныя гаворыць адваротнае: крызіс ня толькі застанавіўся на дне, а паглыбляецца. Трохмільярдны бюджэт ужо ў першым квартале даў значны дэфіцыт і, як піша «Газэта Варшаўска», «далейшае зьмяншэньне даходаў зьяўляецца няўхільным», а «доўгае прабыцьцё на дне крызісу і вельмі і вельмі павольнае ўздыманьне пагражае ўдушэньнем».

Зусім відавочна, што крызіс не дасягнуў свайго кульмінацыйнага пункту і што паглыбленьне яго няўхільна. Гэта сьцьвярджаецца тым, што аграрны крызіс разьвіваецца з выключнай вострасьцю. Бядняцка-серадняцкія масы сялянства даведзены да літаральнага зруйнаваньня—жабрацтва. Спажывецкая здольнасьць працоўных мас Польшчы зьменшылася да нябывалых разьмераў. Цэны на сельска-гаспадарчыя прадукты такія нізкія, што не аплачваецца мінімальная вартасьць затраты працы. Уведзенае фашысцкім урадам з 1-га мая зьніжэньне заработку служачым на 15 проц. таксама моцна адаб'ецца на спажывецкай здольнасьці. Унутраны рынак, такім чынам, з кожным днём працягвае звужацца. На замежным рынку польская прамысловасьць ня можа канкураваць з больш разьвітымі прамысловымі краінамі, асабліва ў сучасны момант, калі сусьветны крызіс капіталізму і барацьба за рынкі, збыту з кожным днём абвастраюцца.

Стараньні польскага фашысцкага ўраду атрымаць замежную пазыку так сама ня мелі посьпеху. Кабальная зьдзелка з французкімі банкірамі па канцэсію чыгункі Гдыня — Горны Шлёнск, ні ў якім разе не паляншае гаспадарчага становішча Польшчы. А тым часам замежная валюта вельмі хутка ўлятучваецца. Так, за апошнія толькі два месяцы ўбыло 18,5 млн. злотых у замежнай валюце і на 205,1 млн. злотых менш, чым было летась.

Падатковая шруба настолькі моцна закручана, што нават антымістычная ўрадавая прэса выказвае сумненьне, што падатак ня ўдасца ў бягучым годзе поўнасьцю спагнаць. Тая вялізарнейшая армія падатковых чыноўнікаў, якія езьдзяць па вёсках з паліцыяй і апісваюць і распраданоць рэчы бядняка-серадняцкіх мас сялянства за падаткі, атрымлівае рашучы адпор. Бядняцка-серадняцкія масы сялянства Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ўсё часьцей і часьцей узброіўшыся сахарамі і косамі праганяюць зборшчыкаў падаткаў. Фашысцкі ўрад ужо ўвёў у сыстэму, што за падаткамі ў вёску прыяжджае цэлы атрад паліцыі і забірае апошнія рэчы. Аднак, значна зьменшыўся кантынгент людзей, жадаючых купляць гэтыя рэчы і ўжо стала масавым зьявішчам, што на рынку асьвістаюць і нават зьбіваюць сэквэстратараў. Гаспадарчае становішча на вёсцы мяжае з катастрофай.

Буржуазны друк ня можа ўтаіць, што фабрыкі сыстэматычна закрываюцца. Так «Работнік» паведамляе: «1337 буйных фабрык зусім закрыты, у гэты лік не ўваходзяць фабрыкі на якіх працуе менш 50 чал. За апошнія два месяцы закрылася яшчэ 300 фабрык. У мінэральнай прамысловасьці зачынена 335 заводаў, у тэкстыльнай —207 і ў апошнія дні спынілі працу ўсе тэкстыльныя фабрыкі Беластоку. У мэталёвай прамысловасьці зачынена 100 фабрык, а рэшта працуюць па 2-3 дні ў тыдзень. У дрэваапрацоўчай і будаўнічай прамысловасьці збан крутаваліся 432 фірмы. У хімічнай прамысловасьці 25 фабрык спынілі працу і г. д.».

Яшчэ больш катастрафічнае становішча на вугальных капальнях. Польскія газэты перапоўнены паведамленьнямі, што «з прычыны перапрадукцыі і адсутнасьці рынку збыту капальня зачынена. У апошнія часы масава пачалі спыняць работу капальні цынку і волава. Вось караценькае інфармацыйнае паведамленьне сацыял-фашысцкага «Работніка»: «наступныя капальні цынку і волава зусім спынілі работу «Матыльда» (фірмы Гэхэ), «Балеслаў» (Саснавецкага таварыства), «Ілісас» (францускa-польскае таварыства), «Явожно», «Ольга», «Бразавіцы» (фірмы Халенлове), «Крамеглюцкая» і «Фукс Паўліна» (фірмы Донэсмарна), «Люцылія», багацейшай фірмы «Шлёнскія Цынкоўні», «Новая Гелэна», «Бельты Шарлей» і г. д.». Гэта толькі караценькі і далёка ня поўны пералік закрыцьця фабрык, капальняў, заводаў.

Польская буржуазія імкнецца выкарабкацца з крызісу за кошт працоўных мас. Ня гледзячы на тое, што пралетарыят Польшчы ў сучасны момант атрымлівае найменшую заработную плату, што жыцьцёвы ўзровень зусім мізэрны, капіталісты фабрыканты сыстэматычна зьніжаюць заработак і павялічваюць рабочы дзень. Ва ўсёй прамысловасьці, якая яшчэ працуе, капіталісты пры дапамозе сацыял-фашыстаў і фашысцкіх арбітражных судоў зьнізілі заработак на 20-30 і на ват—40 проц.

Фашысцкі ўрад лютым тэрорам прыдушае барацьбу пралетарыяту за палепшаньне свайго дабрабыту. Дастаткова адзначыць толькі некаторыя факты, калі паліцыя, напрыклад, у Пабіянцах штурмавала завод, страляла ў мітынг бастуючых. Гераічны пралетарыят Пабіянцаў звыш 3 дзён адбіваў атакі паліцыі, аднак прымушаны быў пакінуць завод. Такія-ж дзеяньні фашысцкага ўраду мелі месца ў Варшаве, Лодзі, Беластоку, Вільні і г. д. Даведзеныя да руіны пралетарыі Польшчы Зах. Беларусі і Зах. Украіны вядуць упартую барацьбу з крывавай фашысцкай дыктатурай, з дыктатурай беспрацоўя, голаду.

Сярод авантурыстычных колаў буржуазіі і асабліва сярод ваяўнічага фашысцкага крыла, што раз усё больш і выразней выказваюцца думкі аб тым, што выхад з крызісу—у імпэрыялістычнай вайне, у экспансіі на Ўсход. Вось чаму у той час, калі ўся краіна задыхаецца ў спазмах гаспадарчага крызісу, калі прамысловасьць шырокага спажываньня або зусім зачыняецца, або фабрыкі працуюць па 2-3 дні ў тыдзень—ваенная прамысловасьць працуе поўным тэмпам. Работа на ваенных заводах ідзе круглыя суткі. Больш таго, збор прыводзіцца рэгулярна з Францыі, Чэхаславакіі. Прывоз зброі з-за мяжы з кожным месяцам павялічваецца і мае тэндэнцыю росту. Так, 7 мая адбылася сакрэтная парада міністраў-палкоўнікаў, пасьля якой Піўсудскі выклікаў з Прагі пасла Грыбоўскага. Зусім відавочна, што пасьлу Грыбоўскаму даручана весьці далейшыя перамовы з фабрыкай Шкода, па закупцы зброі.

Агульна вядомы факт, што вайсковае міністэрства фашысцкай Польшчы паглынае звыш 46 процантаў усяго дзяржаўнага бюджэту. Калі ўлічыць, што і рэшта міністэрстваў так або інакш выконвае заказы вайсковага міністэрства, напрыклад, пабудова стратэгічных дарог і інш., дык выходзіць, што на падрыхтоўку вайны ідзе больш 50 проц. усяго дзяржаўнага бюджэту.

Мілітарная палітыка і шалёнае ўзбраеньне фашысцкай Польшчы ў значнай ступені адбіваецца на ўсім гаспадарчым жыцьці краіны. Непрадуктыўныя траты больш паловы народных сродкаў на ўзбраеньне паглыбляюць крызіс. Антымістычная заява міністра Прыстора, што «Польшча ўжо на дне крызісу» зьяўляецца чарговым трукам «эканаміста»—палкоўніка...

Пралетарыят і працоўныя масы Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны, якія на ўласных плянах адчуваюць увесь цяжар крызісу, выхад з крызісу бачаць у нізрынуцьці фашысцкай дыктатуры. З кожным днём расьтуць рады барацьбітоў за дыктатуру пралетарыяту. Авангард пралетарыяту—камуністычная партыя Польшчы—мабілізуе шырокія колы працоўных мас на рашучую барацьбу з урадам беспрацоўя, голаду і вайны. Магутнейшая стотысячная дэмонстрацыя пралетарыяту Польшчы у дзень першага мая пад баявым сьцягам кампартыі, рашучы адпор паліцэйскай зграі і сацыял-фашысцкім дружыннікам сьведчаць аб тым, што рэвалюцыйная хваля нарастае. Набліжаецца час, калі пралетарыят Польшчы рэвалюцыйным шляхам вырвецца «з дна крызісу».

Пралетарыят Польшчы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі вядзе ўпартую барацьбу супроць падрыхтоўкі ўзброенага нападу на СССР, у абарону бацькаўшчыны міжнароднага пралетарыяту. У дні 1-га мая пралетарыят Польшчы яшчэ раз паказаў, што гру дзьдзю татоў абаранць краіну будуючагася сацыялізму.

Ган.

План рэалізацыі акцый павінен быць выканан!

Усім старшыням РВК, копія дырэктарам МТС

Другая дэкада красавіка дае недапушчальнае зьніжэньне рэалізацыі акцый Трактарацэнтра, што складае рэальную пагрозу зрыву заданьня. Растлумачваем гэта неўменьнем ўвязаць гэту работу па зборы сродкаў для пасеўнай. Трактары, аўтамашыны ў існуючыя МТС будуць завязіцца ў залежнасьці ад збору сродкаў. У 1931 годзе восеньню будаўніцтва МТС будзе разгорнута ў першую чаргу ў тых раёнах, якія выканалі заданьне па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

Абвешчаем вымову загадчыкам Ветрынскага і Лёзьнянскага РАЙЗА і дырэктарам МТС т. т. Зыбко і Рабкіну: першы выканаў 0 проц. заданьня па рэалізацыі акцый, другі—0,95 проц.

Аб прынятых мерах паведаміць Трактарацэнтр.

Упаўнаважаны СНК БССР па пасеўкампаніі Рачыцкі.

Упаўнаважаны Трактарацэнтру Камаеў.

Забясьпечыць МТС вадой

Будаўніцтва Копыльскай МТС разьмяшчаецца на плошчы ў 22 га, але на ўсю гэтую тэрыторыю сёлета будзе пабудавана толькі адна студня. Будаўнікі МТС ня ўлічылі, што вада ў вялікай колькасьці патрэбна для трактараў і аўтамабіляў, якія знаходзяцца ў МТС. Апрача гэтага, ў выпадку пажару МТС можа застацца зусім без вады.

Будаўнікі МТС эканомяць грошы на тулнях, але гэтая «эканомія» можа абысьціся вельмі дорага.

Копыльская МТС не павінна быць без вады.

А. Ш.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ
Стар. 2 № 105 (3193)

ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫВЫ

ў мабілізацыі сродкаў насельніцтва

Толькі 60,5 проц. заданьня першага кварталу выканалі ашчадкасы БССР. Гаркамсоды Менску, Віцебску, Гомелю, Бабруйску, Слуцку і Магілёву бязьдзейнічаюць.

Зьнімаць з бюджэту тых, хто ня выконвае плянаў па мабілізацыі сродкаў!

Вылучыць грамадзкіх інструктароў!

Палепшыць работу камсодаў

Выкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва ў трэцім рашаючым годзе патрабуе мабілізацыі ўсіх лішніх сродкаў насельніцтва. Асабліва вялікае значэньне ў гэтым напрамку набываюць ашчаджасы. Вось чаму ашчаджасы павінны атрымаць належную ўвагу з боку ўсіх партыйных, прафесыянальных і грамадзкіх арганізацый.

Але яшчэ да гэтага часу ня ўсе арганізацыі і камісіі садзейнічаньня зразумелі важнасьць і значэньне ашчадправы. Аб гэтым сьведчаць і тыя факты, якія мы сёньня зьмяшчаем. Гэтыя факты гавораць аб тым, што шмат дзе апартуністычна падыходзяць да разгортваньня ашчадправы. Толькі некаторыя камсоды і ашчаджасы працуюць добра.

Для лепшай пастаноўкі работы ва дзяржрэдыце і ашчадправе зараз пры ўсіх камсодах павінны быць арганізаваны кадры грамадзкіх інструктароў, пры чым, на прадпрыемствах у кожным цэху, ва ўстановах з лікам работнікаў у 100 і больш чалавек — павінна быць ня менш двух інструктароў.

Грамадзкімі інструктарамі могуць быць актывісты камісій садзейнічаньня, перадавыя рабочыя (ў першую чаргу ўдарнікі), камсамольцы, калгасьнікі, служачыя са окладу прафактыву, актывісты, работніцы-ўдарніцы.

Вылучэньне гэтых грамадзкіх інструктароў павінна праводзіцца праз агульныя сходы рабочых, служачых, калгасьнікаў, на якіх неабходна абмяркоўваць гэтыя кандыдатуры.

Грамадзкія інструктары абіраюцца на такі-ж тэрмін, як і камісіі садзейнічаньня.

Трэба гэтыя выбары зрабіць масавай кампаніяй, асьвятляць гэта ў мясцовым друку — (насьценгазэты і інш.) Трэба гэтых інструктароў вызваліць ад лішняй нагрузкі. За пасьпяховае правядзеньне кампаніі выбараў камсодаў і грамадзкіх інструктароў павінны адказваць фабзаўмясткомы.

Зрабіць карэнны пералом у рабоце ашчадкас

Работа ашчадных кас недарма прыкоўвае да сябе ўвагу партыйных і савецкіх органаў: каля 40 проц. плану мабілізацыі сродкаў падае на сродкі, якія ўцягваюцца праз ашчаджасы (ўклады, пазыка, мэтавае накапленьне, асабовае страхаваньне). Побач з гэтым, на ашчаджасы ўкладзены апэрацыі па безнаўўных разьлёках, па масавых пладжох насельніцтва, што таксама павінна зьявіцца значным фактарам у справе аздараўленьня грашовага абароту і мабілізацыі сродкаў.

Зараз можна з упэўненасьцю сказаць, што выкананьне рашэньняў ураду да гэтага часу вельмі слаба праводзіцца ў жыцьцё, як ашчадным апарам, так асабліва мясцовымі савецкімі органамі.

У першым квартале адкрыта ўсяго 150 кас, або 20 проц. тадавога плану. За красавік месяц адкрыта 45 кас. Усяго з 1 студзеня па 1 мая 1931 г. адкрыта 195 кас, або 24,5 проц. тадавога заданьня.

Ня цікавяцца работай ашчадкас

У чым-жа асноўная прычына такога значнага недавыкананьня плану? У першую чаргу ў недастатковай настойлівасьці і ініцыятыве райкас, якія ў радзе раёнаў ня здолелі справіцца з гэтай задачай: падпуканьнем кадраў, хапальніц і памяшканьняў.

Райвыканкомы і сельсаветы ў радзе раёнаў зусім ня цікавяцца гэтай справай, не гледзячы на катэгарычную пастанову СНК аб забясьпечаньні ашчадных кас памяшканьнямі. Да такіх раёнаў адносяцца Магілёў, Багушэўск, Быхаў, Бягомль. У асобных раёнах знаходзяцца ўрэтывые адміністраторы», якія проста перашкаджаюць рабоце ашчадкас. У саўгасе «Анопаль», Койданаўскага раёну, дырэктар саўгасу Зьяровіч усялякім спосабам імкнецца выжыць ашчадкасу, не даючы ёй сталага месца работы, забараняўшы свайму рахункаводу ўдзельнічаць у рабоце касы па сумяшчальнасьці з яго асноўнай работай. Для Зьяровіча, відаць, законы савецкага ўраду ня пісаны.

СНК прапанавана гарсаветам і РВК вылучыць па аднаму прадпрыемству, (саўгас-калгас) для арганізацыі ў іх на адной паказальнай ашчадкасе. Да гэтага часу рад РВК нават не абмяркавалі гэтага пытаньня (Клімавічы, Петрыкаў, Мозыр, Копысь, Полацак, Халопенічы). У асобных раёнах хоць паказальная каса і арганізавана, але паказальнасьць існуе толькі на паперы (Бягомль, Менск). Фактычна ў БССР няма ніводнага паказальнай касы.

Камсоды бязьдзейнічаюць

Камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадправе пры РВК і сельсаветах у многіх раёнах зусім не працуюць (Магілёў, Бярэзіна, Бягомль, Ветрына). Раённыя камісіі работай нізавых камсодаў зусім ня кіруюць, у сельскіх саветах камсодаў амаль няма (рад сельсаветаў нават ня ведаюць складу камсодаў). Гарадзкія камісіі садзейнічаньня зусім ня кіруюць работай камсодаў далучаных да гарадоў с.-с. (Менск, Віцебск, Гомель).

Камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадправе пры большасьці калгасаў нават не арганізаваны.

Пастанова СНК БССР абавязвае «на працягу красавіка арганізаваць пры камісіях садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадправе РВК, гарадзкіх сельскіх саветаў, а таксама прадпрыемстваў і ўстаноў — інстытут грамадзкіх інструктароў з ліку рабочага актыву і калгасьнікаў».

Да сёньняшняга дня інстытут грамадзкіх інструктароў не арганізаваны ў наступных раёнах. Парычы, Койданава, Клімавічы, Быхаў, Шклоў, Хоцімск, Бярэзіна, Крупкі, Лоеў, Віцебск, Глуск. Асобныя РВК (Церахаўка Лельчыцы) нават забранілі займацца арганізацыі інстытуту грамадзкіх інструктароў, спасылаючыся на ласеўную кампанію.

Не ажыцьцяўляюць дырэктывы ўраду

Устаноўленае пастановай СНК СССР ад 1-II і СНК ад 3-III—т. г. прэміраваньне лепшых Ф. З. М. К. камсодаў, калгасаў, актывістаў, а таксама працаўнікоў ашчадкас за дасягненьне посьпехаў у галіне разьвіцьця ашчадсправы кас, вельмі слаба папулярызавана і ў жыцьцё не праводзіцца.

Агітацыйна-растлумачальная работа па ашчадсправе праводзіцца не сыстематычна, а толькі па-кампанейску, і ня ўвязваецца з агульнай культмасавай работай, праводзімай сярод працоўных гораду і вёскі. Сам ашчадны апарат, пачынаючы з «галоўкі», не дзяцэньвае гэтай важнейшай галіны працы. З двух пасад інспэктароў па штімасавай рабоце ў кіраўніцтве ашчадкасамі і дзяржкрэдытам БССР, на працягу доўтага часу не замешчана ніводнай.

Вось некаторыя лічбы прарываў ў рабоце ашчадкас:

Заданьне па ўкладах за першы квартал выканана толькі на 60,5 проц. З якіх у горадзе—82 проц., а на вёсцы—40,7 проц. У красавіку выканана толькі 28 проц. месячнага пляну па ўкладах. Ганебна адстаюць па ўкладах Высачаны, Мсьціслаў, Полацак, Церахоўка і інш.

Заданьне па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка ў 4 гады» па сялянскім сэктары выканана толькі ў памерах 53,1 проц. Адстаюць у рэалізацыі пазыкі Дрыбінскі, Журавіцкі, Круглянскі, Касьцюковіцкі, Чырвона-Слабодзкі раёны.

Касавы плян паступленьняў па пазыцы ў першым квартале выкананы толькі ў памерах 59,7 проц. За красавік —значна горш — 22 проц. Прарыў у касавым пляне такім чынам вялікі. Ганебна адстаюць у гэтай галіне Буда-Кашалёў, Бялынічы, Грэск, Дуброўна, Старобін, Капаткевічы і Халопенічы.

Заданьне па швэймашынах таксама яшчэ ня выкананa: рэалізавана 10.200 машын, або 83 проц. заданьня. Дрэнна праходзіць рэалізацыя швэймашын у Гарадоцкім, Грэскім, Жыткавіцкім, Капаткевіцкім і Любаньскім раёнах.

Усё гэта сьведчыць аб неабходнасьці рашучага пералому ў рабоце ашчадкас, каб забясьпечыць поўнае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў.

Перабудаваць работу

Актывізаваць камісіі садзейнічаньня, умацаваць іх склад лепшымі актывістамі з рабочых і калгасьнікаў. Стварыць інстытут грамадзкіх інструктароў па ашчадсправе і дзяржкрэдыту пры РВК, гарсаветах і с.-саветах, а таксама фабрыках, заводах, саўгасах і калгасах.

Арганізаваць камісіі садзейнічаньня пры райкалгасаюзах і ва ўсіх калгасах. Палепшыць сыстэматычную работу прафсаюзаў па выкананьні заключаных саддагавораў на разьвіцьцё ашчадсправы. Узмацніць работу сярод сэзонных рабочых.

Мясцовым савецкім органам трэба ўзмацніць кіраваньне ашчадсправай, устанавіўшы штодзённы нагляд за работай ашчадкас і забясьпечыўшы ім належную дапамогу. Трэба спыніць мабілізацыю загадчыкаў райкас на іншыя кампаніі, што сыстэматычна мае месца ў радзе раёнаў.

Кіраўнікі апартуністычна-бязьдзейнічаючых райкас у далейшым павінны безагаворачна зьнімацца з работы і прыцягвацца да судовай адказнасьці.

Палесс.

Камсоды без кіраўніцтва

Бабруйская гарадзкая камісія садзейнічаньня на працягу шмат часу, за выключэньнем разгляду заяў аб дазволе продажу, або закладзе аблігаваньні, ніякай работы не праводзіць па мабілізацыі сродкаў.

Адсутнічае ўсялякае кіраўніцтва нізавымі камсодамі, якія таксама бязьдзейнічаюць. У выкананьні кантрольных лічбаў па мабілізацыі сродкаў насельніцтва месца значны прарыў. Наседжаньні Гаркамсоду зрываюцца па прычыне неканведваньня іх членамі ад камбінату, шкэйнай фабрыкі, чугуналінейнага заводу, райпрафсавету, райкому камсамолу і інш.

Трэба раз назаўсёды запамятаць, што ад работы Гаркамсоду залежыць пасьпяховае выкананьне адзінага фінансавага пляну. Зараз павінна быць мабілізавана ўвага працоўных мас на прадпрыемствах і ўстановах вакол пытаньняў ашчадсправы шляхам адпаведнага кіраўніцтва з боку Гаркамсоду нізавымі камсодамі, разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Неабходна зрабіць камісію садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадправе працаздольнай.

Майзэльс.

На хвалях самацёку..

Пры Глінскім сельсавеце, Бягомльскага раёну, адкрыта ашчадкаса. Але адкрыві не і на гэтым супакоіліся. Загадчык ашчадкасай Кірвель ніякай работы па вёсках не вядзе па ўцягненьні ўкладчыкаў, а сядзіць штодня ў сельсавеце і чакае пакуль самі прыйдуць. Вось чаму пляны ўцягненьня вольных сродкаў ня выкананы. Таксама дрэнна справа са спагнаньнем паёў у спажыўкаапэрацыю. Па Глінскай краме пай спагнаны толькі на 17 проц. Крамнік Гаўрылоўіч не спагнае з аможных паёў, тлумачачы, што ім немагчыма ўплаціць такія вялікія паі. Вось чаму заможная частка зусім ня плаціць паёў, а тавары бярэ. Беднота ў большасьці сваёй выплаціла паі. А тавары распрадаюцца не па прызначэньні.

А. Падгорны.

Камсоды бязьдзейнічаюць

СЛУЦАК (наш кар.). Фінансавы плян першага кварталу ў Слуцкім раёне выкананы на 72 проц. Асабліва адстае рэалізацыя пазыкі як на гораду так і на раёне. Кантрольнае заданьне выкананa ўсяго на 22,8 проц. Такія мізэрныя лічбы гавораць аб самацёчнасьці, на якую пакідаліся партыйныя і савецкія органы Случчыны.

Камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту працягваюць бязьдзейнічаць, а ў некаторых мясцох зусім адсутнічаюць. Арганізаваны конкурс, які заклікае на сацспаборніцтва на лепшай пастаноўцы работы нізавых камсодаў — месца сабе не знайшоў.

Такое становішча павінна быць зьнішчана. Прарыў павінен быць ліквідаваны.

А. Курдо.

Дайце памяшканьне ашчадкасе

Ня так даўно здарыўся пажар у Вушацку, згарэла амбуляторыя. У зьвязку з гэтым старшыня РВК загадаў загадчыку Вушацкай райашчадкасы эвакуаваць памяшканьне ашчадкасы для амбуляторыі.

Ня гледзячы на рад думак аб тым, што гэтага рабіць нельга, у райкоме КП(б)Б сказалі: «Можна з надрыхтоўкай да мабілізацыі сродкаў пачакаць».

Зараз ашчаджаса мае вельмі дрэннае памяшканьне, маленькае (2,5х4 м.), гэта ў той час, калі памяшканьне для амбуляторыі можна знайсьці іншае. У гэтым пакойчыку працуюць 2 супрацоўнікі і 2 практыканты, ня лічачы загадчыка.

Недарма маецца недавыкананьне плянаў па ашчадсправе, бо няма дзе праводзіць якую-небудзь работу.

Барановускі.

Ня выканалі заданьне

Ашчадкасы Мешанскага раёну не павярнуліся тварам да мабілізацыі вольных сродкаў насельніцтва.

Працаўнікі ашчадкасы сядзяць у касе і чакаюць пакуль хто прынясе грошы. Значэньне ашчадкасы сярод насельніцтва не папулярызавана. Дадзенае заданьне на 1-ы квартал 31 г. у 16.000 руб. ня выкананa. Пазыка «5-цігодка» рэалізавана на 25 проц. Падпіска на пазыку сярод работнікаў ашчадкасы праведзена на 50 проц. месячнай зарплаты.

Камсамолец

ГАРСАВЕТЫ, ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ!

За апошні час у рабоце некаторых Гарсаветаў буйнейшых пралетарскіх цэнтраў намецілася пэўны пералом. Выконваючы дырэктыву сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК аб павароце тварам да вытворчасьці, аб ударніцтве, Маскоўскі, Ленінградзкі, Днепрапятроўскі, Харкаўскі і інш. гарсаветы шырока разгарнулі пераклічку сваіх дэпутацкіх груп, прыстасоўваючы да іх работы ідэю сацыялістычнага канвэера (Днепрапятроўск); па апэрацыйнаму перабудавалі некаторыя свае сэкцыі і на гэтай аснове дамагліся рэальных вынікаў па выкананьні прамфінпляну ва якасных і колькасных паказьніках.

Аднак, прыходзіцца прызнаць, што выкананьне дырэктывы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК аб «рашучай і хутчэйшай перабудове саветаў у адпаведнасьці з карэннымі задачамі бягучага пэрыяду сацыялістычнага будаўніцтва»—праходзіць нездавальняюча. Палітычная актыўнасьць працоўных і асабліва рабочых, узьнятая на вялізарную вышыню апошняй перавыбарчай кампаніяй саветаў, далёка ня ўсюды атрымала арганізацыйнае замацаваньне. Многія гарсаветы, у тым ліку саветы такіх пралетарскіх цэнтраў, як Ніжні-Ноўгарад, Тагіл, Іванава і г. д., не перабудавалі яшчэ сваёй масавай работы тварам да вытворчасьці, ня сталі на чале ўдарніцтва і сацспаборніцтва, не ператварыліся яшчэ ў сапраўдных арганізатараў мас.

На падставе гіганцкіх посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва, працягвае расьці палітычная актыўнасьць, культурны ўзровень працоўных мас; паляпшаецца жыцьцёвы ўзровень рабочае клясы; усё шырэй і глыбей укараняюцца сацыялістычныя формы працы—ударніцтва і сацспаборніцтва, якія зьяўляюцца выяўленьнем новых вышэйшых форм савецкай дэмакратыі. І саветы, як «вышэйшая форма дэмакратызму нават больш таго — пачатак сацыялістычнай формы дэмакратызму» (Ленін, т. XV, стар. 201)—могуць і абавязаны ў поўнай меры выкарыстаць гэтыя палітычныя прадпасылкі. Але для гэтага яны павінны рашуча разгарнуць сваю масавую работу на заводзе, цэху, зьмене. Зараз ужо мала абмяжоўваць масавую савецкую работу рамкамі пляварных паседжаньняў, рамкамі абсьледваньняў і г. д. На даным этапе ў масавую савецкую работу павінны быць уцягнуты дзесяткі тысяч, сотні тысяч рабочых і інш. працоўных.

Вырашыць гэту задачу гарсаветы змогуць толькі ў тым выпадку, калі створаць і ўмацуюць свае масавыя органы на вытворчасьці—заводзкія дэпутацкія групы. Але дэпутацкая група на вытворчасьці будзе жыцьцёвай, стане сапраўднай апорай гарсавету толькі ў тым выпадку, калі аўладае пытаньнямі вытворчасьці, калі сапраўды павернецца тварам да тэхнікі, калі дасьць новы магутны штуршок разьвіцьцю ўдарніцтва і сацспаборніцтва.

Узоры такой большавіцкай перабудовы дэпутацкіх груп мы маем на радзе заводаў і фабрык Масквы, Ленінграду, Днепрапятроўску, на асобных вучастках Магнітагорску і ў інш. пралетарскіх цэнтрах. Такая мэтавая установка мяркуе рашучае адмаўленьне ад шмат якіх старых, зжыўшых сябе, мэтадаў работы гарсаветаў. Кожная сэкцыя, брыгада, дэпутацкая група гарсавету павінна арганізаваць сваю работу такім чынам, каб кожнае мерапрыемства, якое імі праводзіцца, абавязкова давала максымальна станоўны эфэкт. Гэта павінна стаць асноўным і рашаючым паказьнікам сацспаборніцтва ў масавай савецкай рабоце. Асновай саддагавораў і плянаў работы сэкцый і дэпутацкіх груп павінны стаць паказьнікі сабекошту, прадукцыйнасьці працы і аўладаньня тэхнікай, максымальнага выкарыстаньня рэсурсаў, паказальнікаў укараненьня гаспадарчага разьліку і г. д. Да сацыяльна-культурнай работы павінен быць прыстасаван гэты-ж прынцып з адпаведнымі зьменамі. Напрыклад, ахвіі ўсеагульным навучаньнем, якасьць вучобы, зжыцьцё заработніцтва і т. д.

Актуальнейшай задачай гарсаветаў зьяўляецца правядзеньне ў жыцьцё важнейшых мерапрыемстваў па ўпарадкаваньню камунальнай гаспадаркі. Гарсаветам трэба павярнуцца тварам да камунальнай гаспадаркі, трэба ва ўвесь рост паставіць такія праблемы, як упарадкаваньне жыльлёвага пытаньня, гарадзкога транспарту, водазабесьпячэньня, каапэрацыі, паставіць рэзка, ва ўвесь рост, праблему санітарнага аздараўленьня гарадоў—праблему чыстаты. Нам неабходна в усёй сур'ёзнасьцю паставіць пытаньні ўзьвышэньня на неабходную вышыню пастаноўкі гарадзкой статыстыкі, пытаньні плянаваньня гарадзкой камунальнай гаспадаркі. Гарсаветы, у асобе свайго шырэйшага актыву ўдарнікаў, павінны в усёй пралетарскай рашучасьцю і сапраўды па ўдарнаму павярнуцца да найбольш актуальных праблем гарадзкой гаспадаркі, шчыльна падысьці да пытаньняў вытворчасьці. Важнейшай задачай гарсавету зьяўляецца ўстаноўленьне самай шчыльнай сувязі з вясковай пэрыфэрыяй, садзейнічаньне праз арганізацыю шэфства разгортваньню калектывізацыі, садзейнічаньне ў ажыцьцяўленьні важнейшых актуальных лёзунгаў партыі (300.000 га, барацьба за тэхнічныя культуры і г. д.).

Толькі пад кіраўніцтвам партыі, толькі на аснове самай рашучай барацьбы на два фронты і перш за ўсё на аснове барацьбы з правым апартунізмам і барацьбы з практыкай правых спраў, гарсаветы могуць правільна ажыцьцяўляць дыктатуру рабочай клясы. Такім чынам, толькі перабудаваўшы работу ў вышэйпамянёным кірунку, гарсаветы змогуць справіцца з задачай ўцягненьня «новых мільёнаў рабочых і сялян у рады актыўных будаўнікоў сацыялізму»; толькі на гэтай аснове «можна і бязумоўна трэба ўзьняць ролю саветаў у практычным правядзеньні генэральнай лініі партыі ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве» (сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК). (Перадавы артыкул «Правды»).

За ленінскую нацыянальную палітыку.

Пакончыць з фармальнымі адносінамі да беларусізацыі

Выкрываючы клясавую сутнасьць чудзіншчыны, бязьлітасна біць па канкрэтных праявах вялікадзяржаўнага шавінізму як галоўнай небясьпецы на даным этапе

Супрацўленцы беларусізацыі—ворагі ленінскай нацпалітыкі

За апошні час у БССР меў месца рад вылазак вялікадзяржаўнага шавінізму. Адзэй з гэтых вылазак клясавага ворага зьяўляецца вылазка Чудзіна. Выступленьне Чудзіна супроць беларусізацыі, паўтарэньне ім вялікадзяржаўных і нац. дэмаўскіх паклёпаў аб штучнай беларусізацыі, імкненьне русіфікаваць нацыянальныя школы зьяўляецца адкрытым контр-рэвалюцыйным выступленьнем супроць ленінскай палітыкі, супроць пралетарскай дзяржавы. Канфэрэнцыя далучаецца і ўхваляе на станову ЦП саюзу працаўсветы аб вылучэньні клясавага ворага Чудзіна з сяброў саюзу. Мы, асьветнікі, Плешчаніцкага раёну, у адказ на контр-рэвалюцыйную вылазку будзем яшчэ больш рашуча змагацца з усімі ўхіламі і хістаньнямі ад ленінскай нацыянальнай палітыкі і даб'ёмся поўнага выкананьня дырэктыў партыі па беларусізацыі ў сваёй штодзённай рабоце ў школах саўгаса і калгаса. Будзем застрэльшчыкамі ў правядзеньні нац. палітыкі КП(б)Б.

Няхай жыве КП(б)Б—адзіны правадыр пабудовы сацыялізму ў БССР!

Няхай жыве нацыянальная па форме і сацыялістычная па зьместу культура БССР!

„Мы пішам па-беларуску, чаго вы хочаце?"

Ня гледзячы на пэлы рад дырэктыў партыі пра беларусізацыю; апошняя па асобных установах Шклоўскага раёну ўсё-ж не праводзяцца. Возьмем Шклоўскае гарадзкое спажывецкае таварыства. Загадчык гандлёвага аддзелу Багарод ня ведае белмовы і ўсе рэзалюцыі піша выключна на расейскай мове. Між іншым, папярэджваньне яму ўжо некалькі разоў рабілася. Таксама ўвесь апарат гарадзкога спажывецкага таварыства гаворыць па расейску. Калі прыходзіць праверыць беларусізацыю, дык яны ўсе паперы сунуць пад нос і кажуць: «вось мы пішам па беларуску, чаго вы хочаце?» У Шклоўскім гарспажыўтаварыстве мы маем проста нежаданьне ўжываць белмову, ня гледзячы на тое, што працаўнікі белмову ведаюць, за выключэньнем крамнікаў. Аб гэтым сьведчаць такія факты: машыністка гарспажыўтаварыства Лўшыц на запытаньне «чаму гэта сьпіс надрукавалі на расейскай мове», адказвае: «а гэта ён быў напісан на расейскай мове, дык я ўжо не жадала каверкаць». Вось як Лўшыц разумее справу беларусізацыі. Другая работніца спаж. т-ва Вярбіцкая паступаючыя весткі ад крамнікаў, якія напісаны па беларуску і па расейску перакладае апошнія на расейскую мову і на запытаньне чаму вы перакладаеце, адказала: «я спачатку на расейскай мове сумую, а потым ужо перакладаю на белмову». Гэта ня больш як увёртка, каб ратаіць свае нежаданьне пісаць па беларуску.

Ня лепш в беларусізацыяй і ў Дзяржбанку і Белдзяржбудзе, дзе большасьць працаўнікоў ужываюць выключна расейскую мову. Кіраўнікі гэтых устаноў нічога ня робяць для укараненьня беларусізацыі ў сваіх установах. Вось яшчэ прыклад разуменьня беларусізацыі ў Шклоўскай сямігодцы. На заўвагу інспэктара асьвяты чаму настаўнік Паршнёў, выкладчык расейскай мовы, ня ведае і ня вывучае белмову, ён адказвае: «я выкладчык расейскай мовы, дык мне не абавязкова ведаць белмову».

Гэтыя факты яскрава гавораць аб тым, што выкананьню дырэктыў партыі аб беларусізацыі ў Шклоўскім раёне надаецца вельмі мала ўвагі і што праявы вялікадзяржаўнага шавінізму ў Шклове не сустракаюць рашучага адпору.

Брыгадзір.

Рашуча біць па супрацўленцах беларусізацыі

Гэтымі днямі па Слуцку праводзілася праверка беларусізацыі такіх раённых устаноў, як РВК, райкаапсаюз і чыгуначная станцыя. Пры праверцы выявілася, што амаль усе з праверанных устаноў да правядзеньня беларусізацыі падайшлі толькі фармальна. Усе справы і паперы пішуцца на беларускай мове, але большасьць працаўнікоў у гутарках паміж сабою і зваротах да наведвальнікаў ужываць расейскую мову. Прыкладам могуць паслужыць наступныя працаўнікі: у райкаапсаюзе—Жыбуртовіч, Нячай Міхась, Сухалей Мар'я, Мельнік; у райкалгассаюзе—Гельфан і Шахлевіч; в райвыканкоме—Папляўскі, Левін, Дарожка. На чыгуначнай станцыі адзін працаўнік проста заявіў, што ён ня будзе вывучаць белмову таму, што ніба-та зьбіраецца выяжджаць адсюль. Большасьць працаўнікоў праверанных устаноў зусім не разьбіраюцца ў пытаньнях нацпалітыкі партыі і савецкай улады. Ні парт'ячэйка, ні прафарганізацыі гэтых устаноў не вядуць ніякай работы ў гэтым напрамку.

Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па тых, хто ўпарта не жадае ўжываць белмову, хто да практычнага ажыцьцяўленьня палітыкі партыі падыходзіць толькі фармальна.

Кропка.

СЫГНАЛІЗУЕМ НЕБЯСЬПЕКУ

правалу лесасплаву трэцяга рашаючага

З Чэрвенскага, Вушацкага і Ветрынскага раёнаў даносяць: „сплаўная кампанія пад пагрозай зрыву". Ня лепш і ў шмат іншых раёнах. Лесасплаў патрабуе баявых тэмпаў. Гэтыя тэмпы павінны паказаць сплаўныя канторы, вучасткі, арцелі, кожны сплаўшчык і плытагон

На хвалях бязьдзейнасьці

На Вушацкім раёне ў гэтым годзе загатоўлена 18.000 кубамэтраў экспартнага лесаматар'ялу.

Румы Вушацкага вучлеспрамгасу зараз налічваюць 25.000 штук бярвеньня, 2.729 сьлінераў і 161 шымбэр.

Вучлеспрамгас прыступіў ужо да правядзеньня сплаўнай кампаніі. Праводзіцца скатка бярвеньняў у рэчку. Але на сёньняшні дзень мы маем зусім рэальную пагрозу правалу сплаву. Адчуваецца значны недахоп рабочай сілы.

Працаўнікі сплаўной канторы вучлеспрамгасу нічога ня робяць, каб ліквідаваць іх склад лепшымі актывістамі з рабочых і калгасьнікаў. Стварыць інстытут грамадзкіх інструктароў па ашчадсправе і дзяржкрэдыту пры РВК, гарсаветах і с.-саветах, а таксама фабрыках, заводах, саўгасах і калгасах.

Арганізаваць камісіі садзейнічаньня пры райкалгассаюзах і ва ўсіх калгасах. Палепшыць сыстэматычную работу прафсаюзаў па выкананьні заключаных саддагавораў на разьвіцьцё ашчадсправы. Узмацніць работу сярод сэзонных рабочых.

Мясцовым савецкім органам трэба ўзмацніць кіраваньне ашчадсправай, устанавіўшы штодзённы нагляд за работай ашчадкас і забясьпечыўшы ім належную дапамогу. Трэба спыніць мабілізацыю загадчыкаў райкас на іншыя кампаніі, што сыстэматычна мае месца ў радзе раёнаў.

Кіраўнікі апартуністычна-бязьдзейнічаючых райкас у далейшым павінны безагаворачна зьнімацца з работы і прыцягвацца да судовай адказнасьці.

Вушаці.

Барацьба з нізкаводзьдзем—барацьба за сплаў

У сувязі з разгортваньнем сацыялістычнага будаўніцтва па Саюзу ССР, краіне патрэбны будаўнічыя матар'ялы і апал. Лес займае адно з першых месц па колькасьці і па сваёй якасьці ў будаўнічых матар'ялах. Акрамя таго, па сваёй таннасьці ў параўнаньні з іншымі відамі будаўнічых матар'ялаў і апалу, ён таксама ідзе на першым месцы.

Транспартыроўкі самасплавам будаўнічых матар'ялаў і апалу можна прыстасоўваць толькі да драўніны, бо драўніна па сваёй ўдзельнай вазе лягчэй вады і пагэтаму самасплаў, не патрабуючы затрат на сродкі пад'ёмных абсталяваньняў, пры вялікай загружанасьці перавозкамі чыгункі, мае вялізарнае значэньне ў сыстэме народнае гаспадаркі.

Пры сплаве драўніны выдаткі на транспартыроўцы складаюцца з 4-х асноўных элемэнтаў: 1) кошт утрыманьня рабочай сілы, 2) амартызацыя тэхнікі і інвэнтару (снасьці, якары, дубы, лодкі і іншы дробны інвэнтар), 3) кошт выдаткаў рэквізыту (гужба, жорасьці, кіпці і інш.) і 4) выдаткаў па прымушанаму рэгуляваньню гарызонтаў вод на рэчках у сувязі з іх абмяленьнем і захламленасьцю (пабудова вадазборных, ваданапорных гацяў, днопаглыбіцельныя работы, расчыстка русла, пабудова гацяў і г. д.).

Пры пасьпяховым правядзеньні сплаву мы маем мінімальныя выдаткі на перавозках і можам даць кранне таннэ будаўнічы матар'ял і апал з драўніны.

У дарэвалюцыйны час на рэгуляваньне гарызонтаў вады на раках уладарамі лясных дач не зварочвалася ніякай увагі. Прыватнікі эксплёатавалі рэчкі самым ганебным чынам, вырубалі бліжэйшыя лясныя дачы ад ракі і, сплаўляючы лес, ня думалі аб «благосостоянии» рэк.

Па рацэ Бярэзіне 50—60 год таму назад хадзілі глыбокасідзячыя судны, а ў мінулым 1930 годзе ў чэрвені месяцы мы мелі гарызонт вады толькі ў 35 сантымэтраў. Параходны рух спынены. Сплаў ня ішоў. На выплавачных рэчках, там дзе няма гацяў, літаральна адсутнічае вада.

У сучасную вясну мы мелі нябывалае паўнаводзьдзе. Зьнесена да 90 проц. маючыхся гацяў. Правядзеньне сплаву драўніны ў бягучую навігацыю зьвязана з надзвычайнымі цяжкасьцямі. А якую вялізарнейшую страту павошка гэтага году нанесла мясцоваму ўзьбярэжнаму насельніцтву, сельскай гаспадарцы прамысловасьці і ўсёй народнай гаспадарцы.

З нізкаводзьдзем можна яшчэ весьці барацьбу да некаторай ступені штучным і гідратэхнічнымі набудаваньнямі.

Ёсьць і другі шлях — гэта барацьба аблясеньнем рэк. Гэта мерапрыемства патрабуе шматгадовай ўпартай і сыстэматычнай працы.

Сельскія камсамольскія ячэйкі павінны быць застрэльшчыкамі па арганізацыі правядзеньня «Дню Лесу» і, су месна з тэхнічнымі сіламі вучлеспрамгасаў, леспрамгасаў, павінны распрацаваць папярэдні плян правядзеньня дню лесу.

Трэба выявіць месца штучнага лесаднаўленьня ў мэтах аблясеньня водных артэрый. Плян павінен быць распрацаваны і складзены ня толькі на адзін год, а на рад гадоў, бо адным годам работ аблясеньня рэк правесьці немагчыма.

Налічча лесу на водных артэрыях, натуральна, рогулюе гарызонты вод, бо затрымлівае таяньне сьнягоў і паняпраўдзе такім чынам вялізарнейшыя паводкі ў летні пэрыяд. Акрамя таго, рэкі маюць запас вады ад таяньня зімовых залежаў сьнегу. Усё гэта адхіляе нізкаводзьдзе.

Барацьба з нізкаводзьдзем — гэтым страшэнным бічам народнае гаспадаркі — гэта адзін з важных франтоў за пабудову сацыялізму, за выкананьне пяцігодкі ў 4 гады.

Кошэлеў.

Вязка плытоў.

Не хапае сплаўшчыкаў

ЧЭРВЕНЬ. (Наш карэспандэнт). Падрыхтоўка да сплаву на Чэрвеншчыне праходзіць надта марудными тэмпамі.

Сплаўшчыкаў наверабавана толькі 50 проц. З боку сплаўной канторы доўгі час ня было яскравых указаньняў месцам аб умовах вярбоўкі сплаўшчыкаў.

Кантора на сплаву займаецца больш габінэтнымі справамі, спасылаючыся на леспрамгас, за кошт жывой непасрэднай работы па лесасплаву. Назіраюцца зусім недапушчальныя адносіны з боку ўстаноў, якія адмаўляюцца будаваць масты і трэблі, пашкоджаныя паводкай.

Камбінат, які загадвае млынамі ў гэтых мясцох павінен адрамантаваць масты і трэблі, але карыстаючыся момантам сплаву спадзяецца, што Леспрамгас сам пабудуе разбураныя паводкай масты і трэблі каля млыноў.

Спажывецкая каапэрацыя амаль нічога не зрабіла ў частцы наладжваньня харчаваньня для сплашчыкаў.

Трэба зрабіць рашучы пералом у рабоце на сплаву на Чэрвенскаму вуч.

А.

„Прыедзе дзесятнік і зробіць што трэба..."

На тэрыторыі Заскарскага сельсавету не праводзіцца ніякай падрыхтоўкі да лесасплаву. Прэзыдыум і пленум сельсавету гэтым пытаньнем ніколі не займаліся.

Сакратар сельсавету Фаміч ня ведае ці ёсьць на тэрыторыі сельсавету лес, які падлягае сплаву, і наогул ня цікавіцца сплавам.

— «Прыедзе дзесятнік і зробіць што трэба»—кажа ён.

Такія бюракратычныя адносіны да лесасплаву робіцца тым больш злачынкімі, што праз сельсавет цячэ рэчка Вушача, па якой штогод сплаўляюць шмат лесу, а блізка, за 6 кілёмэтраў, знаходзіцца лесазагункт.

Трэба неадкладна пакласьці канец тым апартуністычным адносінам, якія пануюць у Заскарскім сельсавеце да лесасплаву. Моцна ўдарыць па ўсіх, хто недаацэньвае гэты важнейшы вучастак работы.

Праўленьне спажыўтаварыства ніякіх мер да гэтага ня прымае і амаль нічым не рэагавала на разбазарваньне прэмфонду. Уніў арганізаванае сельспажыўтаварыства бязьдзейнічае ў гэтым напрамку і нічога ня думае пра сплаў.

Я. Знаёмы.

Савецкае будаўніцтва

Працоўную жанчыну—на кіруючую работу!

Забясьпечыць шырокую арганізацыю бытавых устаноў

Увага падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы жанчын—членаў саветаў

Больш рашуча вылучаць працоўных жанчын на кіруючую работу

Замацаваць дасягненьні, якія ўжо маюцца

У выніку вялізарнай працы, праведзенай па бытавому разьняволеньню і падняцьцю культурна - палітычнага ўзроўню жанчын, асабліва за апошнія гады, дзякуючы шырока разгорнутай рабоце сярод жанчын, удзел іх у апошніх перавыбарах саветаў узрос у параўнаньні з папярэднімі перавыбарамі з 42,4 проц. да 54,7 проц. у сельсаветах і з 61,7 проц. да 71,7 проц. па гарсаветах.

З году ў год павялічваецца ў саветах удзельная вага жанчын: з 19,6 проц. у 1929 г. да 24 проц. у гэтым годзе. Усяго па 84 раёнах абрана ў склад сельсавету 8887 жанчын і ў гарсаветы 1208 (па 28 гарсаветах).

Але побач з гэтымі дасягненьнямі, мы маем рад і недахопаў.

Дырэктыва аб давядзеньні колькасьці жанчын у склад сельсаветаў да 25-30 проц. поўнасьцю выканана толькі 34 раёнамі, астатнія раёны гэтай дырэктывы ня выканалі. Асабліва гальнебныя прыклады мы маем у наступных раёнах: Грэскі, у якім процант жанчын у сельсаветах складае усяго—13, Заслаўскі — 14,48, Сененскі — 14,55, Гарадокскі — 16, Уваравіцкі — 17 і г. д. У склад прэзыдыуму сельсавету абрана 1051 жанчына, альбо 17,9 проц., у прэзыдыум нацсаветаў 49 жанчын, у склад прэзыдыуму гарсаветаў 55 альбо 18,71 проц., (зьвесткі па 1131 сельсавеце і 28 гарсаветах). Абрана 54 жанчыны старшынямі сельсаветаў, 13 старшынямі нацсаветаў. У гэтай галіне мы маем павялічэньне на 3,2 проц. супроць мінулага году. Старшынямі гарсаветаў абрана 4 жанчыны, альбо 14,29 проц. Адначасова з гэтым маецца 43 раёны, якія ігнаравалі дырэктыву партыі аб вылучэньні жанчын на кіруючую работу і не абралі ніводнай жанчыны старшынёю сельсавету (Шклоўскі, Жлобінскі і інш.).

Па 73 раёнах удзел жанчын на райзьездах саветаў складаў 1712 чал., альбо 20,56 проц., абрана ў склад РВК 467, альбо 20,30 проц., у прэзыдыум РВК 91 жан.,—11,30 проц. і на вялікі жаль мы маем толькі адну жанчыну старшынёю РВК.

Як справаздачная, так і перавыбарчая кампанія саветаў, праходзіла ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. У Рытамлянскім савеце, Талачынскага раёну, жонка кулака падгаварвала бяднячак, (маючы на мэце сарваць сход), крычаць «нам нічога не даюць, а ў нас усё забіраюць». На гэтым-жа сходзе жонкі заможнікаў выступалі супроць кандыдатуры камсамолкі, таму, што яна выступала і выказвалася за 100-проц. правядзеньне самаабкладаньня. У Дрыбінскім раёне бяднячка вёскі Групаўшчына, Пятруніна па падгавору заможнікаў выступіла з яўна кулацкімі казкамі, а калі-ж ёй далі належны адпор, яна заявіла, што яе навучылі заможнікі.

Вынікі вылучэньня жанчын у гарадзкія, сельскія і местачковыя саветы ў гэтую перавыбарчую кампанію высоўваюць перад намі вялізарнай важнасьці адказьнейшыя задачы, —замацаваць гэтыя вынікі, рашуча ў далейшым прасоўваць жанчын-работніц, калгасьніц, батрачак, бяднячак і лепшых серадняцкіх, у першую чаргу ўдарніц, на кіруючую работу ў савецкія і каапэрацыйна - калгасныя ўстановы і арганізацыі. Да гэтага часу, мы мелі значныя посьпехі ў справе залучэньня жанчын на кіруючую работу, але гэтыя посьпехі нізкім чынам задаволіць нас ня могуць. Перавыбары саветаў далі нам новую армію жаночага актыву, у пераважнай сваёй большасьці ударніц - работніц калгасьніц, батрачак і бяднячак, якія з вялікім энтузязмам узяліся за працу.

Сёньня мы маем у сельсавеце калгасьніцу, якая сама ўжо ідзе ў вёску і праводзіць там работу па яе калектывізацыі, якая практычны вопыт калгасу перадае па-за калгас, праводзіць вялізарнейшую работу ў справе перабудовы вёскі на сацыялістычны лад.

Справа замацаваньня жанчын у сельсавеце, высоўваньне лепшых з іх, у першую чаргу ўдарніц, на кіруючую работу, штодзённая і практычная дапамога ім у рабоце з боку сельсаветаў, райвыканкомаў і ўсяе грамадзкасьці, асабліва тым сельсаветам і райвыканкомам, дзе старшынямі зьяўляюцца жанчыны — наша асноўная задача. Неабходна да сельсавету, дзе старшынёю зьяўляецца жанчына, прымацаваць лепшых працаўнікоў прэзыдыуму райвыканкому для практычнай дапамогі. Вялізарнейшыя задачы, якія стаяць у сучасны момант перад саветамі патрабуюць большай кваліфікацыі работнікаў чымся гэта было 3—4 гады таму назад, а таму падрыхтоўка і перападрыхтоўка жанчын—членаў саветаў — зьяўляецца актуальнейшым пытаньнем у рабоце саветаў і выканкомаў. Неабходна зараз-жа пэрыядычна склікаць курсы-нарады жанчын—членаў саветаў — правесьці кароткa - тэрміновыя курсы ў межах раёну, вылучаючы на гэтыя курсы лепш падрыхтаваных выкладчыкаў.

Неабходна паставіць працу так, каб без падрабязнага высьвятленьня становішча работы сельсавету, у якім працуе старшынёю жанчына, біз згоды ЦВК БССР ніводная жанчына з пасады старшыні сельсавету ня была зьнята.

РВК і сельсаветам трэба мець сталы вучот наогул жаночага актыву, ня толькі працуючага зараз у складах саветаў і выканкомаў, але наогул ва ўсіх установах і жанчын былых раней у складах саветаў.

Адамчук.

Законы і пастановы ўраду БССР

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ПАРАДАК ФІНАНСАВАНЬНЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ І ЭЛЕКТРАГАСПАДАРКІ МЯСЦОВАГА ЗНАЧЭНЬНЯ.

Для палепшаньня сыстэмы фінансаваньня дзяржаўнай прамысловасьці і электрагаспадаркі мясцовага значэньня і камунальных прадпрыемстваў, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Пашырыць дзеяньне пастановы СНК БССР за 9 верасьня 1930 г. «Пра парадак фінансаваньня жыльлёвага, камунальнага і культурна-бытавога будаўніцтва праз Белкамунбанк» (З. З. БССР 1930 г., № 35, паст. 227) на фінансаваньне дзяржаўнай прамысловасьці і гарадзкой электрыфікацыі мясцовага значэньня.

2. Фінансаваньне дзяржаўнай прамысловасьці і электрагаспадаркі мясцовага значэньня і камунальных прадпрыемстваў прызнаць беззваротным.

Гэта правіла пашыраецца на асыгнаваньні з дзяржаўнага, рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў ранейшых гадоў, а таксама на далейшы час і на пазычкі, выдадзеныя з рэспубліканскага і акруговых спэцыяльных капіталаў доўгатэрміновага крэдытаваньня дзяржаўнай прамысловасьці і электрагаспадаркі мясцовага значэньня і былых прамысловых фондаў.

3. Пазычкі прызнаныя паводле гэтай пастановы беззваротнымі, залічаюцца ў статутныя капіталы тых прадпрыемстваў, за якімі яны лічацца ў час выданьня гэтае пастановы. Сьпісаньне пазычак у статутныя капіталы афармініць у балянсах на 1 студзеня 1931 г.

4. Выкананьне гэтай пастановы ўскласьці на Белкамунбанк, а нагляд—на Народны Камісарыят Фінансаў. Пра панаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам падаць Белкамунбанк у сьпіс пазычак, якія паводле гэтае пастановы прызнаюцца беззваротнымі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР
К. Бэнэ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гнілякевіч.

25 красавіка 1931 г.
г. Менск.

Палажэньне

пра Галоўнае кіраўніцтва шосаў, грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту БССР

1.

1. Галоўнае Кіраўніцтва шосаў, грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту існуе на правах аб'яднанага на роднага камісарыяту БССР і выконвае наступныя задачы:

а) ажыцьцяўляе плянавае рэгуляваньне і кіраваньне ўсёй справай шосаў, грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту БССР;

б) распрацоўвае і праводзіць мерапрыемствы па рэканструкцыі і рацыяналізацыі дарожнай гаспадаркі і аўтатранспарту;

в) кіруе капітальным будаўніцтвам і эксплёатацыяй шосаў, і грунтавых дарог саюзнага і рэспубліканскага значэньня;

г) ажыцьцяўляе тэхнічнае кіраваньне і агульны нагляд за будаўніцтвам і эксплёатацыяй мясцовых (раёных, сельскіх і спэцыяльнага прызначэньня) дарог;

д) арганізуе тэхнічна-эканамічныя вышуканьні і навукова-дасьледчую справу ў галіне дарожнае і аўтамабільнае гаспадаркі;

е) плянуе і кіруе падрыхтоўкай і скарыстаньнем кадраў для дарожнай і аўтамабільнай гаспадаркі;

ж) распрацоўвае праекты разьмяшчэньня дарог па разрадах; кіруе інструктарыцкіяй ўсяе дарожнае і аўтамабільнае гаспадаркі;

з) кіруе забясьпечаньнем дарожнай гаспадаркі саюзнага і рэспубліканскага значэньня будаўнічымі матар'ялмі, дарожна-машынным і рамонтным паркам усяго дарожнага будаўніцтва;

і) устанаўляе тыпавыя праекты, тэхнічныя нормы дарожнага будаўніцтва і правілы ўтрыманьня і карыстаньня дарогамі;

к) складае перспэктыўныя і гадавыя вытворчыя пляны ўсяе дарожнае гаспадаркі;

л) зацьвярджае тэхнічныя праекты аб'ектаў дарожнага (раённага і спэцыяльнага прызначэньня) будаўніцтва ў межах устаноўленага ліміту;

м) разьмяркоўвае сродкі, якія асыгнуюцца па саюзнаму і рэспубліканскаму бюджэтах на дарожнае будаўніцтва;

н) садзейнічае прыцягненьню сіродкаў насельніцтва, гаспадарчых іншых арганізацый для дарожнага будаўніцтва;

о) распрацоўвае сумесна з ВСНГ пляны вырабу дарожных машын і аўтамабільнага інвэнтару;

п) ажыцьцяўляе агульны нагляд і інспэктаваньне аўтамабільнай гаспадаркі;

р) дае заключэньне аб праектах каштарысах будаўніцтва і эксплёатацыі аўтатранспарту;

с) у адпаведнасьці з зацьверджанымі плянамі вытварае разьмяркаваньне аўтамашын паміж асобнымі аўтамабільнымі гаспадаркамі і раёнамі;

т) вядзе падлік аўтатранспарту, распрацоўвае вынікі гэтага падліку, а таксама пытаньні зьвязаныя з аўтатранспартнай павінасьцю;

у) склікае зьезды і нарады па пытаньнях дарожна аўтамабільнае гаспадаркі;

ф) складае справаздачы аб становішчы дарожна-аўтамабільнае гаспадаркі і падае Савету Народных Камісараў БССР і Цудатрансу.

2. У складзе Галоўнага Кіраўніцтва шосаў, грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту БССР знаходзіцца дарожна-будаўнічае аб'яднаньне якое дзейнічае на гаспадарчым разьлікуне; эксплёатацыя шосаў і грунтавых дарог праводзіцца праз дарожна-эксплёатацыйныя вучасткі.

Будаўніцтва і рамонт дарог раённага і сельскага значэньня праводзіцца дарожнымі органамі раённых выканаўчых камітэтаў.

3. Начальнік Галоўнага Кіраўніцтва шосаў, грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту БССР і яго намесьнік назначаюцца Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

4. Галоўнае Кіраўніцтва шосаў, грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту БССР падзяляецца на сэктары:

а) інспэкцыя, б) сэктар плянава-эканамічны, в) вытворча-тэхнічны, г) снабжэньня і дапаможных прадпрыемстваў, д) аўтамабільны, е) рацыяналізацыі, ж) кадраў, з) эканомікі працы і быту, і) фінансавы, к) мабілізацыйны, л) вышуканьня і праектаваньня дарог і мастоў, м) навукова-дасьледчае бюро, н) сакратарыят.

II.

З выданьнем гэтага палажэньня скасаваць палажэньне пра Галоўнае Кіраўніцтва шосаў, грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту БССР (З. З. БССР 1929 г. № 3, паст. 15).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гнілякевіч.

25 красавіка 1931 г.
г. Менск.

НАША КАНСУЛЬТАЦЫЯ да другой бальшавіцкай

За камбінаваны паміжрадковы пасеў гародаў у калгасах

Пастановамі XVI партзьезду і сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б чэтка вызначаны задачы пашырэньня сацыялістычнай гароднай гаспадаркі, якая ўжо ў 1931 годзе павінна поўнасьцю задаволіць рабочае насельніцтва гароднінай. У адпаведнасьці з гэтым заданьнем па калгаснаму сэктару БССР намечана сёлета засеяць 10.000 га прамысловых гародаў, што прыбліжна перавышае ў 3 разы плошчу гародаў па калгасах мінулага году.

Каб выканаць дырэктыву партыі аб забесьпячэньні рабочых гароднінай, асабліва ўвага павінна быць зьвернута на падвышэньне ўраджайнасьці гародных культур.

У мінулым годзе па некаторых калгасах пад прамысловыя гароды былі заняты плошчы больш чым на 100 га. Гэтыя калгасы атрымалі вялікія ўраджаі гародных культур.

Але поруч з гэтым трэба адзначыць, што ў большасьці калгасаў было шмат недахопаў у справе арганізацыі прамысловых гародаў. Сяўба праводзілася на градах па тыпу дробных, аднаасобных гародаў; апрацоўка на іх вялася ўстарэлымі мэтадамі.

Гародныя калгасы БССР павінны сёлета перайсьці пераважна да машыннай апрацоўкі гародаў. Толькі правільны камбінаваны паміжрадковы пасеў гародаў дае магчымасьць увесьці машынную апрацоўку. Пры правільным камбінаваным паміжрадковым пасеве гуркоў з кораньплодамі, ці капусты атрымліваецца з аднэй тэй-жа плошчы 2 поўных ураджаі. Неадначасовы рост гэтых культур (гуркі галоўны рост даюць у сярэдзіне лета, а кораньплоды і капуста ў канцы лета), большы доступ сьвятла да кораньплодаў і капусты ў параўнаньні з суцэльным пасевам гэтых культур, забясьпечваюць поўны рост абедзьвюх культур.

Ня меншае значэньне для пасеву гуркоў маюць рады кораньплодаў і капусты, якія буйным сваім лісьцем ахоўваюць рады гуркоў ад холаду і не даюць моцным ветрам зблытаць плоці. Кораньплоды і капута ў канцы лета пад сваім нацьнёрным захоўваюць вільгаць, што спрыяе павялічэньню вэгетацыйнага пэрыяду гуркоў, а разам з гэтым павялічэньню ўраджаю іх. Шырокая адлегласьць паміж радкамі дае магчымасьць свабодна праводзіць машынную апрацоўку.

Камбінаваны пасеў дае магчымасьць лепш выкарыстаць рабочую сілу і лепш далглядаць за гуркамі. Пры паміжрадковым камбінаваным пасеве пры зборы гуркоў, ходзячы па радкох, менш можна пашкодзіць турэчнику.

Пры арганізацыі камбінаваных паміжнародных пасеваў гародных культур трэба прытрымлівацца наступнага парадку:

1. Ворыва праводзіць шырокімі загонамі, каб менш было баразён, пры баранаваньні барозны трэба эраўняць. На цяжкіх ці нізкіх глебах, дзе трэба пакідаць барозны для спуску дажджавой вады, загоны трэба рабіць такой шырыні каб можна было зрабіць поўную колькасьць радкоў (лонак) без астачы на загоне.

2. Гной трэба класьці не саломісты, бо апошні перашкаджае машыннай апрацоўцы. Пры ўнясеньні гною непасрэдна ў радкі, па якіх робіцца пасеў гуркоў і кораньплодаў—яго трэба кідаць пад плуг пры ворыве праз 4—5 баразён, у залежнасьці ад вызначанай шырыні, паміжрадкоўя, як гэта робіць калгас «Соцвяг», Парыцкага раёну. Ні ў якім разе ня трэба ўносіць гной пасьля ворыва, гэта патрабуе лішняй коньнай і людзкой сілы, апрача таго, дастаўка гною па ўзораным утоптвае глебу. Трэба адзначыць, што пад пасевы гуркоў раіцца ўносіць мясцовае ўгнаеньне (пад расьліну) толькі ў тым выпадку, калі гэтая плошча была ўгноена з восені ў разьмерах ня менш паловы нормы (20-30 тон).

Адлегласьць паміж радкамі ў залежнасьці ад гатунку гуркоў, кораньплодаў і капусты і якасьці глебы робіцца ад 0,90 мтр. да 1,25 мтр. Напрамак радкоў лепш рабіць на поўдзень, але трэба прыстасоўваць напрамак радкоў да спаду. Папярочны напрамак радкоў да спаду ня раіцца, бо пры моцных дажджох могуць здарыцца вымоіны.

4. Чаргаваньне радкоў трэба рабіць ня больш чым з 2-х культур: гуркі і адзін з відаў кораньплодаў. У залежнасьці ад плянавых заданьняў калгасу можна паміж радкамі гуркоў садзіць побач па два радкі кораньплодаў. Можна дапусьціць таксама пасеў паміж гуркамі побач па 2 рады—рад сталовых буракоў, рад моркві. Пры разьмяркаваньні пасеваў кораньплодаў і капусты трэба кіравацца запатрабаваньнем кожнае культуры да глебы, разьмеру угнаенасьці і г. д.

5. Гародны масыў трэба падзяліць на вучасткі па 2-3 га. У напрамку радкоў (ломак) даўжыня вучастку не павінна перавышаць 100 мтр. Такая даўжыня дае магчымасьць лёгка праводзіць апрацоўку і збор ураджаю. Паміж вучасткамі пакідаецца дарога шырынёю ў 2 мтр. Папярочныя бакі вучастку (галоўкі) ня трэба засяваць, каб можна было пры апрацоўцы выходзіць з машынай на дарогу.

Апрача паміжрадковага камбінаванага пасеву гуркоў трэба спыніцца на камбінаваным засеве ўнутры радкоў. Калгас «Чырвоны хлебарабо», Гомельскага раёну, садзіў разам памідоры з раньняй капустай у шахматным парадку. Пасьля ўборкі раньняй капусты памідоры свабодна разьвіваюцца.

У даным артыкуле закрануты толькі асноўныя моманты характарныя ў працы камбінаваных гародаў. Пры правядзеньні другой бальшавіцкай сяўбы трэба поўнасьцю скарыстаць маючыяся кадры вопытных калгаснікаў па гароднай справе шляхам арганізацыі буксірных брыгад для дапамогі і кіраўніцтва працай у больш слабых калгасах.

Пастрон.

Аб мерапрыемствах па бытавому абслугоўваньню саўгасьніц і калгасьніц

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР.

Шпаркі рост аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі, уцягненьне шырокіх мас батрачак, бяднячак і сераднячак у саўгасы і калгасы, спэцыялізацыя сельскай гаспадаркі у значнай колькасьці раёнаў па лініі разьвіцьця жывёлагадоўлі і лёнаводзтва, у якіх пераважную ролю адыгрывае жаночая праца, з асаблівай вастратой ставяць пытаньне арганізацыі бытавога абслугоўваньня саўгасьніц і калгасьніц. Ад вырашэньня гэтага пытаньня у значнай меры залежыць плянамернае і поўнае скарыстаньне жаночай працы, уцягненьне саўгасьніц і калгасьніц у вытворчую працу калгасаў і рашучае бытавое разьняволеньне саўгасьніц і калгасьніц.

Мерапрыемствы, якія вызначаюцца на 1931 год Народнымі Камісарыятамі Аховы Здароўя і Асьветы—арганізацыя сеткі ясельных і дашкольных устаноў у колькасьці 2.309, дзіцячых устаноў з ахопам 69.350 дзяцей, з іх дашкольных устаноў 1.075 з ахопам 32.250 дзяцей, ясельных 1.234 устаноў на 37.100 дзяцей, у асноўным накіраваны на абслугоўваньне аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі.

Пры адшуканьні крыніц фінансіраваньня бытавых устаноў была узята правільная лінія на мабілізацыю бытавых фондаў грамадзкіх арганізацый (лекавых фондаў — 193,5 тысяч руб.; ЦК Чырвонага крыжу — 49 тысяч; ЦКДД — 40 тысяч; саюз сельска-гаспадарчых рабочых — 94 тысяч.; Белкаапсаюз — 200 тыс. і інш. — усяго 1.458.500 руб., з іх бюджэтных сродкаў — 53,1 проц.).

Улічваючы, што мяркуемая сетка дзіцячых устаноў зьяўляецца мінімальнай і павінна быць значна пашырана за кошт сродкаў насельніцтва, Прэзыдыум Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР пастанаўляе:

1. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам і саветам, а таксама праўленьням калгасаў разгарнуць шырокую масавую работу вакол пытаньняў арганізацыі бытавых устаноў у саўгасах, калгасах і для адзінаасобнікаў за кошт сродкаў самаго насельніцтва, калгасаў, мясцовых грамадзкіх арганізацый, з прыцягненьнем грамадзкасьці, бытавых сэкцый сельскіх саветаў, культбытавых камісій калгасаў, дэлегацкіх сходаў і г. д.

2. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам, сельскім саветам і праўленьням калгасаў забясьпечыць своячасовае разгортваньне сеткі ясельных і дашкольных устаноў і бесьперабойную іх работу шляхам дачы памяшканьняў, апалу, інвэнтару, своячасовага фінансаваньня і поўнага скарыстаньня бытавых фодаў па мэтаваму прызначэньню.

Для практычнага кіраўніцтва бытавымі установамі практыкаваць прымацаваньне да бытавых устаноў членаў прэзыдыуму сельскіх саветаў, заслухоўваньне на пленумах раённых выканаўчых камітэтаў справаздач райаддзелу аховы здароўя, райінспэктуры асьветы аб становішчы працы бытавых устаноў, зьвяртаючы асаблівую увагу на мэдычны нагляд над дзіцячымі ўстановамі.

Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам мяркуемую сетку дзіцячых устаноў разгарнуць у першую чаргу ва ўдарных і спэцыялізаваных саўгасах і калгасах, сельскіх саветах з найбольшым процантам калектывізацыі і нацсаветах з такім разьлікам, каб мяркуемая сетка устаноў была цалком разгорнута ў час масавых палявых работ пасеўнай і ўборачнай кампаній.

Для набліжэньня адзінаасобніц да калгасаў, у калгасных ясьлях і дашкольных установах забясьпечыць месцы для дзяцей адзінаасобніц — бяднячак акаляючых вёсак.

4. Прапанаваць Наркамснабу і Белкаапсаюзу уключыць сетку ясьляў і дашкольных устаноў у плянавае снабжэньне.

5. Прапанаваць раённым бытавым камітэтам склікаць нарады кіраўнікоў бытавых сэкцый сельскіх саветаў і культурна-бытавых камісій калгасаў для абгаварэньня плянаў ясельнай кампаніі на раёну, пытаньняў максымальнага пашырэньня сеткі бытавых устаноў за кошт мабілізацыі сродкаў насельніцтва і грамадзкасьці.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гнілякевіч.

30 красавіка 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

АБ АРГАНІЗАЦЫІ ХАТКАЎСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ЎКРАІНСКАГА СЕЛЬСКАГА САВЕТУ, НАРАЎЛЯНСКАГА РАЁНУ.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Арганізаваць Хаткаўскі нацыянальны ўкраінскі сельскі савет, Нараўлянскага раёну, ў сучасных межах Хаткаўскага сельскага савету.

2. Прапанаваць Нараўлянскаму РВК забясьпечыць абслугоўваньне ў Хаткаўскім сельскім савеце нямецкага і польскага насельніцтва на роднай мове.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гнілякевіч.

25 красавіка 1931 г.
г. Менск.

ТЭАТР-КІНО

Беларускі Другі Дзярж. тэатр	Сёньня закрыты спэктакль **КАЧАГАРЫ** І. ГУРСКІ — Пачатак а 8 гадзіне —
„Чырвоная Зорка“	Амэрыканскі фільм **У апошнюю хвіліну** (Плыві, дзяўчына, плыві) Пачат. а 7, 8 45 і 10 30 г. Каса адч. з 5 г.
Кіно-тэатр „Культура“	РЭВАНШ Звыш праграмы Хроніка № 20 Пач. а 7, 8 45, 10 30 г.
Кіно ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ	Замежны фільм ШЛЮБ АБ ЗАКЛАД Пачат а 6 г. Каса адч. з 4 гадз. 30 хвіл.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“	Монці Бэнкс у лепшай камэдыі **Гоншчык супроць волі** Звыш праграмы хроніка Саюзкіно. Пачат. а 7 г.
Кіно „Юны Піянэр“	Усходні фільм — **АЛІМ** Кіно-апав. у 7 частках Пачат. сэансу а 1 г. дню. Каса адч. з 11 г.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА

усіх зацікаўленых арганізацый і ўстаноў, што ў мэтах своячасовай падрыхтоўкі да будаўніцтва 1932 году

Праектна-Тэхнічнае Бюро пры Белбудканторы пры БЖС, ЯКОЕ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў г. МЕНСКУ ПА ПРАЛЕТАРСКА-НАБЕРАЖНАЙ, 14

ПАЧАЛА ПРЫМАЦЬ ЗАЯВЫ

па праектаваньню ўсялякага віду грамадзкіх будаваньняў.

Кіраўніцтва Белбудканторы.

У сувязі з ліквідацыяй і спыненьнем усіх апэрацый **ЛІКВІДКОМ** Чачэрскага райспажыўтаварыства паведамляе ўсе ўстановы і фізычных асоб, што **усялякія прэтэнзіі да названага т-ва** будуць прымацца **ДА 15 ЧЭРВЕНЯ.** Пасьля паказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца і разглядацца ня будуць.

Ліквідком Чачэрскага райспажыўтавэрства.

ГИЗ КНИГОЦЕНТР

МАССПАРТГИЗ Московский Рабочий

ОТКРЫТА ПОДПИСКА на 1931 г.

НА НОВЫЙ ЖУРНАЛ

ДЕРЕВЕНСКИЙ ПРОПАГАНДИСТ

ДВУХНЕДЕЛЬНЫЙ ОРГАН КУЛЬТПРОПА МОСК. ВКП(б)

ВЫХОДИТ С МАРТА 1931 г.

ЗАДАЧИ ЖУРНАЛА: обслужить среднего и низового деревенского пропагандиста. Мобилизовать колхозную, бедняцкую и середняцкую массу деревни на борьбу за социалистическое переустройство сельского хозяйства, за большевистское проведение хозяйственно-политических кампаний на селе, содействовать через сеть партпросвещения росту и повышению идейно-политического уровня деревенской парторганизации. Журнал освещает актуальные вопросы с.-х. политики, практики социалистического строительства в деревне, применительно к специальным зонам Московской области, вопросы партпросвещения и роста деревенской парторганизации, вопросы организации и методики работы деревенской сети партпросвещения. Обмен опытом пропагандистской работы на селе. Журнал дает консультацию по вопросам политики и организационной работы партии в деревне, а также оперативный материал для пропагандистов по вопросам хозяйственных политкампаний и обзоры политической с.-х. литературы.

ПОДПИСНАЯ ЦЕНА: с апреля до конца года (за 18 №№)—2 р. 25 к. на 6 мес. 1 р. 50 к., на 3 мес. 75 к. Цена отд. № 15 к.

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ: в Минском отделении книгоцентра ОГИЗа, Советская, 41, в ближайших магазинах книгоцентра и повсеместно на почте.

На падставе пастановы СНК БССР ад 3-V 1931 г. Дзяржаўная Экспортна-Імпартная Гандлёвая Кантора „ДЗЯРЖГАНДБЕЛ“ ЛІКВІДУЕЦЦА.

Прэтэнзіі належыць накіроўваць ЛІКВІДКОМУ па адрасу: Менск, Пляц Волі, № 7.

Тэрмін для прад'яўленьня прэтэнзій да 15 чэрвеня 1931 г., пасьля чаго ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

Ліквідком.

Да ўвагі рабселькораў, ударнікаў друку, рэдакцый газэт.

25-га мая „Правда“ выпускае чарговую ўкладку, прысьвечаную пытаньням рабселькораўскага руху.

Просім усіх ударнікаў і рабселькораў „СБ“ своячасова паклапаціцца, каб моць гэты нумар „ПРАЗДЫ“.

Піваварны завод „Беларусь“ АДПУСКАЕ ЎСІМ ПІЎНЫЯ ДРОЖДЖЫ па 25 кап. літр.

Заводакіраўніцтва.

ЗГУБЛЕНЫ:

Партбілет № 1305751 Магазынчыкаў А. С., выд. Горацкім Райкомам, членскі білет № 36934, выд. Горацкім саюзам Рабземлес.

Вайсковая кніжка Хмуровіч І. Ф., выд. Горацкім ваенкаматам.

Вайсковая кніжка Салдацёнкаў Е. Е., выд. Горацкім ваенкаматам.

Кандыдацкая партпкартачка Саловіча Ф. І., выд. Аршанскім акругкомам.

Вайсковая кніжка Барбасава Т. Н., выд. Горацкім ваенкаматам.

Вайсковая кніжка Шапавалаў С. Я., выд. Горацкім ваенкаматам.

Вайсковая кніжка Паўлаў М. Е., выд. Горацкім ваенкаматам.

Вайсковая кніжка Шмурэў В. П., выд. Горацкім ваенкаматам.

Вайсковая кніжка Столбанаў П. П., выд. Горацкім ваенкаматам.

Вайсковая кніжка Лазараў Н. Л., выд. Горацкім ваенкаматам.

Вайсковая кніжка Салдаценкаў Р. Г., выд. Горацкім ваенкаматам.

Вайсковая кніжка Чуркіна М. Е., выд. Горацкім ваенкаматам.

Вайсковая кніжка Собалева М. Е., выд. Горацкім ваенкаматам.

Паявая кніжка Антоненка З., выд. Аршанскім ЦРК, маг. № 18, кв. 273-п.

Паявая кніжка Агнісьцік Е., выдан. Аршанскім ЦРК, маг. № 16, кв. 273-п.

Вайсковы білет Дзелоўскі Н., выд. Дубровенскім РВК кв. 273-п.

Паявая кніжка № 16513 Бролінін А., выд. Аршанскім ЦРК, кв. 273-п.

Паявая сэзонная кніжка, выд. Аршанскім ЦРК, маг. № 18 Гаравая Д.

Пашпарт Нікіціна І., выд. Добрянскім сельсаветам Гомельскага раёну, квіт. 273-п.

Вайсковы білет Мурашоў І., выд. Тулянскі сельс. Іркутскай абл., кв. 273-п.

Табачная картка Карабкін Д., выд. Аршанскім ЦРК, маг. № 18, кв. 273-п.

Вайсковы білет Бабцоў С., выд. 192 стр. палком, кв. 273-п.

Наборная картка Петрачэнка, выд. Аршанскім ЦРК, маг. № 18, кв. 273-п.

Наборная кніжка Жыско Д., выд. Аршанскім ЦРК, маг. № 18, кв. 273-п.

Табачн. картка № 5479 Каган З., выд. Аршанскім ЦРК, маг. № 16, кв. 273-п.

Табачная картка № 6973 Хамутоўскі І., выд. Аршанскім ЦРК, квіт. 273-п.

Паявая кніжка Малчанаў А., выдан. Аршанскім ЦРК, маг. № 16, кв. 273-п.

Вайсковы білет нарадж. 1909 г. Чэркаса Н. А., выд. Старобінскім РВК, квіт. 274-п.

Вайсковы білет нарадж. 1905 г. Савіна К. А., выд. 2-й белар. дывізіі, квіт. 275-п.

Вайсковы білет нарадж. 1902 г. Высоцкага І. М., выд. Нараўлянскім РВК, кв. 276-п.

Членская кніжка Германа Я. М., выд. Заслаўскім Райгрупкомам у 1929 г., за № 9688, кв. 277-п.

Мэтрычны ліст на аліменты Хрушчыкавай М. О., выд. Ляднянскім нарсудом 4 вуч.

Вучотна-вайсковая кніжка на імя Васненкава Н. Г., выд. Ляднянскім РВК

Вучотна-вайсковая кніжка на імя Мураўёва Е. Д., выд. Ляднянскім РВК.

Вучотна-вайсковая кніжка на імя Лагутова С. Л., выд. Ляднянскім РВК.

Вучотна-вайсковая кніжка на імя Макарава Савелія Ільіча, выд. Баеўскім РВК.

Вучотна-вайсков. кніжка на імя Кіреева П. І., выд. Ляднянскім РВК.

Вучотна-вайсковая кніжка Верамей Е. А., выд. Ляднянскім РВК.

Пасьведчаньне аб праходжаньні вайсковай службы на імя Аўраменка А. А., выд. Віцебскай ротай сувязі.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

ДОМ ПРАЦАСЬВЕТЫ.

11 мая кіно. «Сонная Красуня». Пачатак 8 г. 30 хв. і 10 г.

12 мая а 6 гадз. увечары у Культпропе ЦК КП(б)Б склікаецца нарада па увязцы партасьветы з вывучэньнем тэхнікі.

Павінны зьявіцца наступныя т. т. Куліненка, Любін, Улазаў, Саевіч, Сямёнаў, Яцкевіч, Перлына, Альгінская, Гурэвіч,—завод «Камунар», Ханіна—Друкарня, Слонім, Васідовіч, Немец, Макоўскі, Садоўскі, Шукевіч, Гольдштэйн, Гурвіч Ц., Голанд, Апольскі, Рудой, Серафімаў, Зарамбоўскі.

Яўка абавязкова.

11-га мая, а 8 гадз. ўвечары, у Доме Кам. Асьветы адбудзецца даклад тав. Выдра, на тэму: «Твар нацдэмакратызму ў краязнаўстве».

Білеты па ячэйках і чытальні дому.

ПАПРАЎКІ.

У прывітальні газэце «Чырвоная Зьмена» ад газэты «Савецкая Беларусь», зьмешчаным ў № 104 ад 10-га мая т. г., у тэксьце прывітаньн 3 разы надрукавана слова «інкоры», а трэба чытаць «юнкоры».

У гэтым-жа нумары газэты «Савецкая Беларусь» па тэхн. недагляду перабліталы подпісы, пад кліше, якія зьмешчаны на трэцяй старонцы. Подпіс, які пастаўлены пад кліше аб Дзяржснабе, адносіцца да кліше аб Белкаапсаюз